**Касаткіна, Ф.** Так мала зязюля яму накувала… / Ф. Касаткіна // Звязда (Пастаўскі р-н). — 1989. — 30 верас. — С. 2.

## ТАК МАЛА ЗЯЗЮЛЯ ЯМУ НАКУВАЛА…



Апошнія дні верасня. Шчодрае бабіна лета. Сонечныя, незвычайна цёплыя, усцешныя дні.

Жоўтае лісце зрываецца нячутна з галін, кладзецца да падножжа прыкметна абноўленага абеліска ў Целяках, увянчанага ордэнам Вялікай Айчыннай вайны. Два роўныя слупкі імён на абеліску. Імён тых, каго няма ў гэтай зямлі, але хто нарадзіўся, жыў, працаваў на ёй, а ў гады Вялікай Айчыннай загінуў на франтах ці ў партызанскіх атрадах. За свабоду Радзімы, за яе будучае.

Праз рэчку за Целякамі другая веска – Турлы. І другі абеліск там. На грамадзянскіх могілках. Урбель Аляксандр Казіміравіч, – высечана імя на граніце. Дзве даты: чэрвень 1965 – студзень 1985-га.

– За што, Сашанька, сынок мой, за што ты злёг у зямельку? – галосіць мама, у соты, а можа тысячны раз прыпадаючы да дарагога астраўка зямлі, усланага кветкамі.

– За што? – падымае яна на мяне выплаканыя, змучаныя незалечнай тугой вочы.

І я маўчу. Я не ведаю, што адказаць ёй...

– І адпачыць не паспеў перад арміяй, – цішэе, сушыць не можа высушыць насоўкай вочы Таццяна Рыгораўна Урбель. – Да апошняга, пакуль не атрымаў павестку, працаваў на трактары. А ўручылі – праз тры дзянькі і пайшоў. Праўда, праводзіны паспелі зрабіць. Усіх сабраў тады Сашанька ў хату – сяброў, дзяўчатак, знаёмых. Весяліліся, наказы давалі.

А праз год, студзеньскім днём 1985-га горш, чым ад самага лютага марозу сцяліся, застылі ад горкай весткі Турлы, Целякі, іншыя суседнія вёскі – вайскоўцы прывезлі хаваць Аляксандра Урбеля.

Ён вельмі любіў тэхніку. Таму і ў тэхвучылішча пасля васьмігодкі пайшоў на трактарыста вучыцца. У інтэрнаце жыць не хацеў. Штодня, нават зімой, прыязджаў дадому. І тады, як і ў школе, цягнуліся да яго себрукі. Заўсёды молада, светла, весела было ў хаце Урбеляў.

– А як жа яму матацыкла з каляскай хацелася – успамінае маці. – Бывае, зімой залезу на печку, прыйшоўшы з фермы, пагрэцца і Сашка да мяне прылашчыцца. А гаворка ў яго ўсё адна – пра матацыкл. «Навошта ён табе, сын, – адгаворвала. – Адслужыш у арміі – мы табе машыну купім». Не купілі...

У тую восень з калгаса імя Мічурына ўходзілі на службу многія юнакі. Хто куды трапіў. Саша – у вучэбнае падраздзяленне, адтуль – у Афганістан.

– Як прыслаў Саша першае пісьмо з Афганістана, дык і памеркла для нас сонца, а потым і зусім закацілася, – зноў душаць слёзы Таццяну Рыгораўну. – Душой бяду чулі. Вось і ў тыя дні, калі сынок цяжка ранены ляжаў, не знаходзіла сабе спакою. Прыйду з фермы напрацаваная, а заснуць не магу. То стукне хто, то пакліча здаецца. Сэрца, відаць, маё да сынка рвалася. Не даляцела. Не памагла. Не ўберагла. І цяпер спакою аніякага. Дні – як пад хмарамі. Ночы – не збыць. Кідаешся з боку на бок, прасціну ў вяроўку скруціш. Прысніся хоць, Сашанька, бога малю. Ды не ўбачу ніколі выяўна. Усё як у паўзмроку.

Новы, 1985 год Аляксандр Урбель сустрэў у Баграме. Сабраў іх камандзір, павіншаваў са святам. І разышліся ўсе па сваіх пастах. Радавы Урбель, старшы вадзіцель-электрык станцыі спутнікавай сувязі – на сваю станцыю. Што думаў, чаго жадаў, аб чым марыў салдат пад Новы год? Адно магу сказаць пэўна – аб жыцці! А смерць стаяла за плячыма. У тую ж навагоднюю ноч у выніку сляпога артабстрэлу Саша атрымаў цяжкае раненне і праз некалькі дзён памёр у шпіталі.

Якім быў Саша? Што ён паспеў здзейсніць у кароткім сваім жыцці? Гэтыя пытанні я задавала не толькі яго бацькам, але і многім іншым людзям, хто ведаў яго. І ўсе сыходзіліся на адным: цудоўны хлопец! Нават скупыя радкі характарыстыкі, дасланай ў раённы ваенны камісарыят з СПТВ-165, пацвярджаюць гэта: «Займаецца добра. Працавіты, на ўборцы бульбы ў калгасе ўвесь час трымаў першыя месцы. Яшчэ больш любіць працаваць на тэхніцы. Ветлівы са старэйшымі, таварыскі, добрасумленна выконвае ўсе даручэнні. З'яўляецца членам рэдкалегіі ў групе, любіць чытаць мастацкую літаратуру. Парушэнняў дысцыпліны не мае. Былі аб'яўлены дзве падзякі».

Краніт Фёдаравіч Пушкар, былы Сашаў класны кіраўнік, гаворыць: «Такая добрая душа! Спакойны, адкрыты, дружбісты. І вучні, і настаунікі любілі Сашу. Ва ўсіх добрых справах зачыншчык. Не падумайце, што хвалю таму, што яго ўжо няма. Не, Саша сапраўды быў вельмі добрым хлопчыкам».

Быў. Якое цёмнае, безвыходнае слова. Яго равеснікам сёння па 24. Яны кахаюць, мараць, працуюць. Жывуць. Саша навекі застаўся 20-гадовым. Без яго цячэ паўз вёску рэчка, на якой ён, заядлы рыбалоў, мог прападаць гадзінамі. Без яго цвітуць сады і ападаюць яблыкі. Без яго гуляюць вяселлі, будуюць жыллё.

У Таццяны Рыгораўны і Казіміра Людвікавіча дзяцей трое. Саша – малодшанькі. Ці не таму і любілі яго асабліва пяшчотна. А можа, што па характару быў ён мяккі, спагадны, хатні. Старэйшыя ж, Галя і Валодзя далёка, у Латвіі. У іх свае сем’і, свае турботы. Да бацькоў, вядома, наведваюцца, дапамаюць. Але не вельмі часта наездзішся за сотні кіламетраў.

Разглядаем сямейныя альбомы. Таццяна Рыгораўна расказвае пра дзяцей, унукаў, доўга-доўга трымае ў руках рэдкія аматарскія фотаздымкі Сашы. Вось гарэзнае хлапчанё на беразе ракі,

тут – невялічкі выпускны клас Целякоўскай васьмігодкі, а вось ён ужо калгасны механізатар, з групай вяскоўцаў на экскурсіі. І, адна-адзіная «сур'ёзная» картачка, зробленая, відаць, на нейкі дакумент. З яе і партрэт павялічаны. Сур'ёзна, запытальна, даросла глядзіць з гэтага партрэта Саша на родны дом, які апусцеў без яго, на тужлівую сівізну, што густа ўплялася ў маміны валасы, у апусцеўшыя татавы вочы. Ён жыве ў гэтым доме і будзе жыць пастаянна. У снах і ўспамінах, у кожным дні і ночы. Як будзе жыць памяць пра кожнага з яго равеснікаў і неравеснікаў, загінуўшых, выконваючы воінскі абавязак. У іх не пыталіся, трэба гэта ці не, справядліва ці несправядліва. Ім аддавалі загад. І яны ішлі ў самае пекла Афганістана. А мамы і таты, сёстры і каханыя ніклі ў скрусе і трывозе за іх. За тых, хто не вярнуўся і за тых, хто выжыў, але застаўся скалечаны і душой, і целам.

Мы стаялі з Таццянай Рыгораўнай ля магілы Сашы, і ўспамінаўся мне злёт маці прызыўнікоў восенню 1987-га. Тады  ўжо было аб'яўлена аб вывадзе нашых войск з Афганістана. Прагучала гэта і ў дакладзе ваенкома. Як апладзіравалі гэтаму паведамленню маці! І як плакалі яны  – з радасці і болю.

Дзве вайны апалілі чорным горам лёс Т. Р. Урбель. Адна, Вялікая Айчынная, якая забрала бацьку, другая – неаб'яўленая, загубіўшая сына.

– Засталася маці з намі, чацвярыма, – успамінае Рыгораўна. – А немец і хату спаліў. Голад, смерць кругом. Па свеце бадзяліся, скарынку хлеба шукалі. Выкарабкаліся неяк. А пасля вайны ў Карэлафінск па вярбоўцы паехала. Там і з Казімірам пазнаёміліся. Яго таксама голад з роднага кута ў свет пагнаў. Не расказаць, як цяжка жыццё сумеснае пачыналі, з нічога. А цяпер усё маем, пенсіі добрыя атрымліваем. Ды навошта яно ўсё, калі самае дарагое – дзіця страцілі.

...На сцяне ў доме Урбеля зноў цікаюць спыненыя 13 студзеня 1985 года ходзікі. Раз-пораз адчыняюцца іх дзверкі, выскаквае зязюля і лічыць – гадзіны, дні, гады. Зязюля-зязюля, птушка-вястуння, што ж ты так мала накувала хлопцу, які так любіў жыццё?

**Ф. Касаткіна**

***На здымку: Аляксандр Урбель***